# САМЫ СВЕТЛЫ ТАЛЕНТ — ДАБРАТА

*(Сяргей Грахоўскі)*



— Лянок, мы ўчора хадзілі на каток, — расказвала Васілінка. — Адна маленькая дзяўчынка часта падала: яна яшчэ не навучылася добра стаяць на каньках.

— А ўсе смяяліся, — з дакорам перапыніў Васілінку Лянок.

— Не, старэйшая дзяўчынка ўзяла яе за руку, і яны пачалі катацца разам.

А як бы вы паступілі ў такой сітуацыі?



Правообладатель Национальный институт образования

Нараві́стая — *тут*: гара, якая патрабуе ад дзяцей спрыту, смеласці ў час спуску з яе. Нато́ўп дзетвары́ — шмат дзяцей.

Разгледзьце малюнак. Паслухайце верш. Хто з герояў верша выклікае спачуванне?

## З гары

*Васіль Жуковіч*

Як садзіўся ехаць Санька
ля натоўпу дзетвары́,
не́як вы́слізнулі санкі
і памчаліся з гары.

Доўга чуўся дружны смех,
што не ехаў Санька — бег.

Потым выйшла так, што Санька
сам паехаў па лядку́.
На гары ляжалі санкі,
спачывалі на баку.

Зноў усім была пацеха,
што на футры Санька з’ехаў.

Правообладатель Национальный институт образования

Ды знайшоўся камандзір —
добры сябра Федзя, —
узяў малога «на буксі́р»
і сказаў:
— Паедзем!

Шпарка ехалі сябры
з наравістае гары.

1. Чаму дзеці смяяліся з Санькі? Ці можна назваць іх добрымі сябрамі?
2. Хто дапамог Саньку? Чаму? Падмацуйце свой адказ радкамі з верша.
3. Чаму аўтар называе Федзю камандзірам?
4. Ці хацелі б вы пасябраваць з Федзем? Якія рысы характару гэтага хлопчыка вам спадабаліся? Каго можна назваць сапраўднымі сябрамі?
5. З якімі пачуццямі трэба чытаць апошнія радкі верша? Навучыцеся выразна чытаць верш.
6. Як вы разумееце сэнс прыказкі: «Чалавек без сябра, што дрэва без карэння»? Ці падыходзіць яна да зместу верша? Растлумачце вашу думку.


Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце і адгадайце акразагадку. Выразна вымаўляйце галосныя.

**З**ямлю снегам замяла
**А**д сяла і да сяла.
**В**ецер гу́рбы абдымаў
**І** да неба падымаў.
**Р**а́нкам глянулі ў акно:
**У**х! Ад снегу ледзь відно.
**Х**тосьці мёў, і хтосьці выў.
**А**дгадайце, хто ж там быў?

*Уладзімір Мацвеенка.*

Небара́ка — *рус.*: бедняга.
На прыдво́рку — *рус.*: во дворе.

Прачытайце назву апавядання, разгледзьце малюнак. Падумайце, пра што можа ісці размова ў творы.

## Пагрэйся, ветрык!

*Фама Рамашка*

Ася намалявала прыгожага матылька. Устала з-за стала і падышла да акна: «Чым жа цяпер заняцца?»

Правообладатель Национальный институт образования

На прыдворку блішчалі замерзлыя лужыны, крыху пры-ця-ру́-ша-ны-я снегам. Нечакана шыбы ў акне за-трым-це́-лі. Затым нібы хтосьці пасту́каў, пачуўся свіст. Дзяўчынка нават спа-ло-ха-ла-ся.

«Ды гэта ж вецер, — нарэшце здагада́лася Ася. — Замёрз, небарака. Просіцца ў дом, пагрэцца хоча».

«Што ж рабіць?» Адчыніла акно. Паве́яла халодным ветрыкам. Гардзі́на прыўзнялася і павісла на карнізе. У пакоі закружыліся газеты, за-шар-па-це́-лі старонкі та́тавай кніжкі.

— Вецер, не дурэй! Я ж пусціла цябе пагрэцца.




Правообладатель Национальный институт образования

Але вецер не слухаўся дзяўчынку. Стала зусім холадна.

— Ну, калі ты такі не-па-слу-хмя-ны, уцякай прэч! — пакрыўдзілася Ася і адчыніла дзверы.

Яшчэ больш засваволіў вецер.

— Не слухаешся, не пушчу болей, — дакарала Ася вецер.

Хуценька зачыніла дзверы, а пасля — акно. Навяла парадак у пакоі.

Толькі свой малюнак не знайшла. Вецер, напэўна, узяў з сабою: спадабалася яму, як Ася малюе.

1. Хто з герояў твора вам спадабаўся? Чым?
2. Прачытайце, як Ася пачула свіст ветру. Пра што падумала дзяўчынка?
3. Чаму Ася вырашыла пусціць вецер у дом? Ці можна назваць яе клапатлівай, спагадлівай дзяўчынкай? Чаму?
4. За што пакрыўдзілася Ася на вецер?

Пафантазіруйце, куды знік малюнак Асі. Для чаго ён спатрэбіўся ветру? Калі яго зноў магла ўбачыць дзяўчынка?

Правообладатель Национальный институт образования